

*Да арт. **Анімацыйнае кіно**. Кадр з анімацыйнага фільма «Ёрш і Верабей».*

выяўл. сродкі А.к., засвойваліся розныя тэхналогіі: «ажыўшы жывапіс», камп'ютэрная анімацыя, кінакалаж (спалучэнне анімацыі са здымкамі з натуры і жывога акцёра) і інш. На сучасным этапе бел. А.к. вызначае высокі прафес. ўзровень, разнастайнасць творчых манер. Ствараюцца анімацыйныя казкі «Чароўная крама» (2006), «Жабка-вандроўніца» (2007), «Жыла-была апошняя Мушка» (2009, рэж. усіх А.Пяткевіч), «Залатыя падковы» (2006, рэж. І.Кадзюкова), «Пра сяброўства, Шарыка і лятаючую талерку» (2008, рэж. А.Ленкін). Гісторыя жыцця праваслаўных святых — Пятра і Феўронні — адлюстравана ў анімацыйнай стужцы «Старадаўняя аповесць пра жыццё, любоў і іншыя дзівы» (2008, рэж. І.Кадзюкова).

*Да арт. **Анімацыйнае кіно**. Кадр з анімацыйнага фільма «Казка пра вясёлага клоуна».*



На сюжэт жартоўнай бел. нар. песні знята стужка «Як служыў я ў пана» (2005, рэж. У.Пяткевіч). Унікальным з'яўляецца праект «Аповесць мінулых гадоў» (2006—08), прысвечаны гісторыі ўзнікнення гербаў гарадоў Беларусі (аўтар ідэі і маст. кіраўнік І.Воўчак, сцэнарысты Д.Якутовіч і М.Бяршадская, рэж. У.Пяткевіч, М.Тумеля, І.Кадзюкова, А.Ленкін, Н.Хаткевіч, маст. А.Мацюшэўская, Т.Кубліцкая, Я.Надточэй, Н.Касцючэнка). Серыя фільмаў «Беларускія прымаўкі» (2007—08, сцэнарыст і рэж. М.Тумеля, маст. А.Мацюшэўская) у мяшанай тэхніцы прадстаўляе мікраметражныя фільмы на тэмы бел. прыказак і прымавак. З 1998 у Беларусі праводзіцца міжнар. фестываль А.к. «*Анімаёўка*».



*Да арт. **Анімацыйнае кіно**. Кадр з анімацыйнага фільма «Залатыя падковы».*

*Літ.*: Карпілава А. Анімацыйнае кіно // Гісторыя кінамастацтва Беларусі. Мінск, 2004. Т. 4; Голикова Е. Белорусская анимация: исторический экскурс // Белорусское кино в лицах. Минск, 2004.

*Я.У.Голікава-Пошка, А.А.Карпілава.*

**АНІМЕ́ЛЕ** Мікалай, беларускі этнограф сярэдзіны 19 ст. Вольнаадпушчаны (б. прыгонны) селянін Віцебскай губ. Сабраныя ім матэрыялы па праграме Рус. геагр. т-ва склалі большую частку выдадзенай т-вам працы «Побыт беларускіх сялян» («Этнографический сборник», 1854, вып. 2). Пераважнае месца ў ёй адведзена матэрыялам пра духоўную культуру беларусаў: абрады і звычаі сямейнага і грамадскага жыцця сялян Віцебскай губ.; падрабязна апісаны парадак уступлення ў шлюб і вясельныя абрады; прыведзены звесткі пра жыллё, гасп. пабудовы, адзенне, ежу, прылады працы сялян; змешчаны прымаўкі, песні, паданні. А. высока ацэньваў маральныя і творчыя якасці сялянства, працавітасць, падкрэсліваў яго сац. і маёмасную дыферэнцыяцыю напярэдадні адмены прыгоннага права.

**АНІМІ́ЗМ** [ад лац. anima (animus) душа, дух], надзяленне свядомасцю, воляй, характарам і інш. чалавечымі рысамі прадметаў і рэчаў жывой і нежывой прыроды, вера ў жыццё душы пасля смерці, у духаў, што ўвасабляюцца ўсемагутнымі багамі. А. узнік як вынік абмежаванага разумення чалавекам прыродных стыхій (пажар, землятрус, паводка і інш.), з цягам часу стаў неад'емнай часткай язычніцкіх уяўленняў (*магія*, пантэізм, *фетышызм*, дуалізм, *татэмізм* і інш.), а пазней і хрысціянства. У навуцы першым тэрмін «А.» усебакова абгрунтаваў англ. вучоны Э.Тайлар (Тэйлар) у працы «Першабытная культура» (1871). У традыц. культуры беларусаў А. з'яўляецца неад'емнай часткай абрадаў, свят, твораў фальклору. Анімістычную афарбоўку мае кожны вобраз ніжэйшай і вышэйшай міфалогіі (Сварог — бог неба і агню, Зюзя — бог зімы, Палявік — дух поля і нівы і г.д.), фантаст. істоты, якія сімвалізуюць абрады і святы (Каляда, Купала, Ляля і інш.), фалькл. персанажы (Мядзведзь, Каза, Жораў, Конь і інш.). Анімістычнае мысленне і вераванне заўважана і ў адносінах да Спарыша — падвойнага коласа, які ў нар. песнях малюецца як жывая істота, бог ураджаю: «Сядзь жа, Спарыш,// За кляновым сталом.// За зялёным пітвом.// Спары жа мне, Спарыш,// І ў полі, і ў доме,// І ў гумне, і ў двары,// І ў пячы, і ў клеці,// І ў клеці карабом,// І ў пячы пірагом». А. прысутнічае ў пахавальна-памінальнай абраднасці бела-

русаў, напр., у кульце продкаў (гл. *Дзяды*). Паводле яго чалавек пасля смерці працягвае сваё існаванне на «тым свеце», пераўвасабляецца ў духа-продка, які можа дапамагаць або шкодзіць сваім нашчадкам у жыцці. Добра захаваўся А. у веснавой абраднасці. Анімістычныя ўяўленні ўласцівы кожнай рэлігіі. У хрысціянстве А. праяўляецца праз веру ў Святога Духа, злых сіл і духаў, анёлаў і інш. Сучасная нар. культура — сінтэз традыц. абраднасці і хрысціянства, у якой спрадвечныя язычніцкія элементы часам суіснуюць з хрысціянскімі рытуаламі і канонамі, у т.л. і анімістычнымі ўяўленнямі.

*Літ.*: Тайлор Э. Первобытная культура: пер. с англ. М., 1989; Токарев С.А. Ранние формы религии. М., 1990; Ліцьвінка В.Дз. Святы і абрады беларусаў. Мінск, 1997; Шарая В.М. Ушанаванне продкаў як даследчыцкая праблема ў працах Э.Тайлара і Г.Спенсера // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2001. № 4.

*А.М.Аляхновіч.*

**АНІСЕ́НКА** Валерый Данілавіч (н. 5.6.1944, г. Талачын), беларускі акцёр, рэжысёр. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1991). Скончыў Бел. тэатр.-



*В.Д.Анісенка.*

маст. ін-т (1965), Вышэйшыя рэжысёрскія тэатр. курсы пры Дзярж. ін-це тэатр. мастацтва ў Маскве (1978). У 1965—77 акцёр бел. тэатраў творах бел. л-ры. З 2000 дырэктар і маст. кіраўнік Рэсп. тэатра бел. драматургіі. Рэжысёрскай манеры А. ўласцівы прафесіяналізм, імкненне да актуальнасці, спалучэння гісторыі і сучаснасці. Сярод пастановак: «Рычард» (1995) і «Макбет» (1996) У.Шэкспіра, «Жанчыны Бергмана» М.Рудкоўскага (2001), «Понцій Пілат» (2002) і «П'емонцкі звер» (2004) А.Курэйчыка, «Кабала святош» («Мальер») М.Булгакава (з С.Кавальчыкам, і роля Мальера) і «Трыбунал» А.Макаёнка (абодва 2005), «Белы анёл з чорнымі крыламі» Дз.Балыка (2006), «Каласы пад сярпом тваім» У.Караткевіча (2008), «Чайка» А.Чэхава (2009), літ.-вак. кампазіцыя «Прызнанне» (2007) і інш. Аўтар кн. «Запіскі пачынальніка» (2004). Дзярж. прэмія Беларусі 1990. Прэмія «За духоўнае адраджэнне» 2005.

*Літ.*: Грамыка Л. Валерый Анісенка. На шляху віравання // Мастацтва. 2009. № 6.

**АНІ́СІМАЎ** Аляксандр Міхайлавіч (н. 8.10.1947, Масква), беларускі і расійскі дырыжор. Засл. дзеяч мастацтваў Расіі (1988). Скончыў Ленінградскую (1975), Маскоўскую



*А.М.Анісімаў.*

(1980) кансерваторыі. Працаваў у тэатрах оперы і балета Расіі. У 1980—84 і з 1989 гал. дырыжор аркестра творчага аб'яднання «Нацыдырыжорскі жэст, моцная энергетыка і высокі прафесіяналізм. Прапагандуе бел. нац. і класічную оперную і сімф. музыку. Пад яго муз. кіраўніцтвам пастаўлены нац. балет «Курган» Я.Глебава (1982), оперы «Новая зямля» Ю.Семянякі (1982), «Дзікае паляванне караля Стаха» У.Солтана (1989), «Майстар і Маргарыта» Я.Глебава (1992), а таксама ў канцэртным выкананні камічная «Мядзведзь» С.Картэса (2009), упершыню прагучалі сімф. творы Г.Гарэлавай, С.Картэса, А.Мдывані, Дз.Смольскага і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1990.

*Літ.*: Вайткуновіч А. Музыка, якую чуюць сэрцам // Беларусь. 2009. № 6.

*Н.А.Юўчанка.*

**АНІ́СІМАЎ** Насонка, разьбяр па дрэве 17 ст. Выхадзец з Беларусі. У 2-й пал. 17 ст. пераехаў у Маскву, дзе працаваў у Майстарскай палаце Маскоўскага Крамля. У 1648 разам з інш. бел. майстрамі «рабіў палаці і ставіў іканастасы» ў Данской царкве.

**АНІ́СІФАР** Дзевачка (свецкае імя невядома, імя па бацьку Пятровіч; ? — паміж 1592 і 1594), мітрапаліт кіеўскі, галіцкі і ўсяе Русі [1579—89]. Пасля 1568 — архімандрыт Лаўрышаўскага манастыра. У 1579 абраны мітрапалітам, ад караля польск. і вял. князя літоўскага Стэфана Баторыя атрымаў у пажыццёвае ўладанне і кіраванне Віленскі Троіцкі манастыр, дамогся зацвярджэння пры ім праваслаўнага брацтва (1584). Правіў праваслаўнай царквой у ВКЛ у цяжкіх умовах унутранага крызісу і наступу каталіцызму. Жыў пераважна ў Новагародку (у 1584 віленскія мяшчане скардзіліся каралю, што мітрапаліт рэдка бывае ў Вільні). З імем А. звязана выданне ў друкарні Мамонічаў «Службоўніка» (1583). Дамогся ад Баторыя пацвярджэння прывілея Жыгімонта I Старога аб незалежнай юрысдыкцыі праваслаўнай царквы (1585), дазволу